**ДРУГІ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

**IX клас**

**(за кожную арфаграфічную і пунктуацыйную памылку здымаецца 0,1 бал)**

**Заданне 1.** Пісьмова адкажыце на пытанні.

*Максімальны бал — 5.*

1. Які дзеяслоў у форме інфінітыва адпавядае значэнню ‘*падаваць у парадыйным выглядзе*’? — ______________________________________.
2. Які лічэбнік (*абодва, абое, абедзве*) неабходна ўставіць у сказ? Запішыце ў патрэбнай форме. *Васіля і Ганны* — ____________ *не было на занятках*.
3. Дзе знаходзіцца асноўны і пабочны націск у словах? Абазначце.

   Верхнезубны, верхнекаменнавугальны, вышэйназваны, раным-рана, унутрывідавы, упрысядкі.

**Заданне 2.** Запішыце сказы па-беларуску (2 балы: 0,5 бала за правільна запісаны сказ. Калі пры напісанні слоў ў сказе дапушчана хоць адна памылка, балы не налічваюцца). Запішыце, якімі часцінамі мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы (3 балы: 0,5 бала за кожную правільна названую часціну мовы).

*Максімальны бал — 5.*

1. Виола **тебе и** копейки не даст. 2. **А**, попался! – воскликнул он. 3. Друг уехал, я **же** остался. 4. Я **уже** год живу **у** родителей.

____________________________________________________________
____________________________________________________________
____________________________________________________________
____________________________________________________________
____________________________________________________________
_______________________________________

**Заданне 3.** Ад назоўнікаў *брат*, *сястра* ўтварыце прыналежныя прыметнікі і праскланяйце словазлучэнні*: акуляры брата* і *сяброўка сястры*.

*Максімальны бал — 5. За кожную памылку здымаем 0,5 бала.*

________________________________________________________
____________________________________________________________
____________________________________________________________
____________________________________________________________
____________________________________________________________
__________________________________________

***Прачытайце тэкст і выканайце заданні 4–6.***

(1) Каля **самага** берага было гразка. (2) Праз метры два дно цвярдзела і здавалася пахруствала пад нагамі. (3) Не было тут здрадлівых ямак, у якія можна было боўтнуцца з галавой, са дна, падціскаючы пальцы на назе, можна было браць цвёрдыя і калючыя, бы шрот, пясчынкі і дробныя каменьчыкі. (4) Купаліся доўга і весела, але няўмела, баючыся заплываць на глыбокае, хоць кожнае лета бавіліся толькі вось гэтым возерам. (5) Яно ляжала сярод высокіх берагоў вялізнай блакітна-хвалістай хусткай. (6) Па гэтай дрогкай азёрнай хусцы, няроўна зарубленай цёмнымі лазнякамі, пазначанай вузламі старых вербаў, плаўна і бясшумна, амаль не пакідаючы за сабою слядоў, праплывалі чаўны. (7) Нават ямачка ад кінутага каменьчыка **хутка** знікала. (8) Веры здавалася, быццам пад гэтым бліскучым, як напятым у ціхае надвор'е, шоўкам вады павольна і важка круціцца вакол сваёй восі нейкае вялізнае кола. (9) Варочаецца, бы ў яме, зацягвае ў свой калаўрот усё жывое і ў сваім няспынным руху ў адзін момант сцірае з паверхні возера глыбокія раны ад вёслаў, кругі і шырокія палосы ад нагружаных чаўноў.

**Заданне 4.** Запішыце стыль тэксту, тып маўлення і тры асноўныя стылёвыя рысы.

*Максімальны бал — 5.*

____________________________________________________________________

____________________________________________________________

**Заданне 5.** Запішыце.

*Максімальны бал — 5.*

1. Тэрмін-прыметнік, якім называюць слова, не выдзеленае знакамі прыпынку, што ўскладняе будову другога сказа тэксту: __________________
2. Слова з ***3-га*** сказа, якое мае ў сваім складзе толькі ***корань*** і ***два суфіксы***: ________________________________________
3. Разрад выдзеленай часціны мовы ў ***1-м*** сказе: ______________________
4. Слова з ***6-га*** сказа ў пачатковай форме, якое складаецца толькі з галосных і глухіх гукаў: _____________________________________
5. Характарыстыку ***6-га*** сказа па граматычнай структуры: ____________ ___________________________________________.

**Заданне 6.**

**А.** Падкрэсліце антонімы-фразеалагізмы да выдзеленага ў ***7-м*** сказе слова:

1) як не сваімі нагамі; 2) адным махам; 3) ціхім ходам; 4) як па смерць; 5) без аглядкі.

*1 бал за правільна падкрэслены адзін фразеалагізм*

**Б.** Выпішыце з тэксту ў пачатковай форме прыметнікі, якія адпавядаюць значэнням:

1) ‘які з цяжкасцю паддаецца сцісканню, згінанню, рэзанню і пад.; процілеглае мяккі’: ________________________________________ ;

2) ‘які выклікае трасенне; няроўны, нягладкі’: _______________________

*Максімальны бал — 2.*

**Заданне 7.** Перабудуйце трохчленныя словазлучэнні ў адпаведныя па сэнсе двухчленныя канструкцыі.

*Максімальны бал – 8.*

| | |
|---|---|
| Краіна паўднёвага ўсходу | |
| дзіця сямі месяцаў | |
| хвароба сэрца і сасудаў | |
| прадукцыя добрай якасці | |
| машына для ўборкі торфу | |
| алмаз дзвюх граней | |
| бэлька пяці метраў | |
| першадрукі са старажытнай Беларусі | |

**Заданне 8.** Запішыце адпаведныя чатыры пункты з правіла.

*Максімальны бал – 8 (1 бал за пункт правіла + 1 бал за прыклад да гэтага пункта)*

| | |
|---|---|
| Не выдзяляюцца коскамі параўнальныя звароты з ***як***, калі: | 1) |
| | 2) |
| | 3) |

**Заданне 9.** Указаны літаратуразнаўчыя тэрміны. Знайдзіце «трэцяга лішняга» ў кожнай групе. Выбар абгрунтуйце.

*Максімальны бал — 6 (1 бал за ўказанне “трэцяга лішняга” + 1 бал за абгрунтаванне)*

А) Амфібрахій, харэй, анапест.

Б) Раманс, раман, нарыс.

В) Метафара, эпітэт, песня.

А) ______________________________________________________________
______________________________________________________________

Б) ______________________________________________________________
______________________________________________________________

В) ______________________________________________________________
______________________________________________________________

**Заданне 10.** Вызначце жанр, назву твора і яго аўтара па ўказаных словах.

*Максімальны бал — 8.*

1. Дружына, князь, харам багаты, бяседа, вяселле, гуслі, песня-дума, дачка княжна, гусляр: _______________________________________________
2. Пісьманосец, Тэкля, вайна, сын Вася, Ульянка, надзея, помнік: _______
_________________________________________________________
3. Тэкля, пан, Лаўрук, палясоўшчык, хатулачка, рамізнік, гарадавы, тратуар, трохрублёвыя паперкі: ____________________________________________
4. Бітва крывавая, сын, зярняты, маці, дарога палявая, камень шчарбаты, чужынцы:
_______________________________________________________
5. Поле, хата, тканіны, думкі, збожжа, васількі, узор: ___________________
_____________________________________________________________
6. Крыніца, снег, жывучая вада, вольны свет, паэт: ______________________
______________________________________________________________
7. Антоні, ягамосці, грыбы, Свержань, Міхалінка, сок, клёцкі: _____________
______________________________________________________________
8. Жураўлі, Палессе, Беларусь, край, рай: _______________________________
______________________________________________________________

**ДРУГІ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

**X клас**

**( за кожную арфаграфічную і пунктуацыйную памылку здымаецца 0,1 бал)**

Прапанаваны тэкст быў надрукаваны ў 1921 г. у кніжцы для чытання пасля буквара «Родны край», калі дзейнічалі правілы беларускай арфаграфіі, сфармуляваныя Браніславам Тарашкевічам. Прачытайце тэкст і выканайце заданні 1–5.

**Восень**

(1) Над пахмураю, мокраю зямлёю павісла шэра-цёмнае, нуднае восеньскае не́ба.

(2) Пустая вуліца маўчыць. Людзі, калі ўдварэ, дык сядзяць па хатах. І коні ў пуні, бо ў полі зямля заме́рзла, і толькі сяньня троху адтаяла і пакрылася зьве́рху ліпкаю гразьзю. А ў лагчынах яшчэ бяле́ецца на лагу і блізка ле́су бе́ленькі, рэдкі снегавы налёт. Смутна гудзіць абголены гай на ўзгорку. У незахістанай ані сувалкаю, ані чым на зіму, пуні плятнёвай мычыць карова.

(3) Не багаты хварбамі тутэйшыя малюнкі. Зусім бе́дна гукамі паветра глыбокае восені ў глухой вёсцы.

(4) На вуліцы — груда, ліпка зве́рху ў пагодлівы дзень. Пуста. Нікога. Рэдка дзе пад паўдзён пракандыбаець дзе́д з **рэзьгінамі** да старога гуме́нца. Накінуўшы паўсьвітак, шпарка прабяжыць дзяўчына да тавары́шкі з вышываньнем пад палою.

(5) Вось і ўсё. На рагу, ля канцавога двара, прывязан за аброць к банцы ў шуле́, запрэжаны ў «бяду» ціхі і спакоўны гняды конь. Ён апусціў галаву, зьвесіў вушы і ня есць. Жмуток балотнага се́на сіратліва рассыпаецца перад ім па ве́тры. На «бядзе́» на пажоўклай сухой гарохавіне не́йкі ме́х, запэцканая, закачаная торба, аржавая асака гнядому каню.

*М. Гарэцкі*

**Заданне 1.** Выпішыце словы (слова), дзе: 1) у адпаведнасці з тагачаснымі правіламі павінен пісацца мяккі знак; 2) у адпаведнасці з тагачаснай логікай абазначэння націскных галосных павінен стаяць знак націску; 3) у адпаведнасці з сучаснымі нормамі гук [ф] абазначаецца літарай **ф**.

*Максімальны бал — 5.*

1) ____________________________________________________________

2) ____________________________________________________________

3) ____________________________________________________________

**Заданне 2.** Запішыце адказы. 1) У выніку чаго развіваецца ў слове мнагазначнасць? (1 бал)

2) Выпішыце з другога (2) і трэцяга (3) абзацаў тэксту ў пачатковай форме словазлучэнне (1 бал) і спалучэнне слоў (1 бал), што з’яўляюцца прыкладамі найбольш частых спосабаў пераносу значэнняў. У дужках укажыце назвы гэтых спосабаў (2 балы: па 1 бале за кожную назву).

*Максімальны бал — 5.*

1) ____________________________________________

2) ____________________________________________

**Заданне 3.** Запішыце адказы.

1) Якія словы-сінонімы вы ведаеце: а) да прыметніка *глыбокае*, што ўжыты ў ***3-ім*** абзацы (1 бал), б) да назоўніка *пад палою* з 4-га абзаца? (1 бал).

2) Якое значэнне мае выдзеленае слова з 4-га абзаца? (1 бал).

3) Якое слова з тэксту адпавядае значэнню «вялікая халодная будыніна для складвання і абмалоту збожжа»? Запішыце яго ў пачатковай форме (1 бал).

4) Прыгадайце антонім да падкрэсленага слова з першага абзаца (1 бал).

*Максімальны бал — 5.*

1) ____________________________________________

2) ____________________________________________

3) ____________________________________________

4) ____________________________________________

**Заданне 4.** (1) Якімі літарамі можа быць выражаны канчатак назоўнікаў у форме множнага ліку назоўнага склону? Пацвердзіце свой адказ прыкладамі назоўнікаў з тэксту (не менш трох прыкладаў на адну літару). Пры адсутнасці ў тэксце слоў-прыкладаў, запішыце свае прыклады-назоўнікі ў множным ліку.(3 балы)

(2) Выпішыце з тэксту два назоўнікі, пры ўтварэнні множнага ліку якіх адбываюцца змены ў аснове. Побач запішыце формы множнага ліку гэтых назоўнікаў. (2 балы)

*Максімальны бал — 5.*

(1) ____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

(2) ____________________________________________

**Заданне 5.** Выпішыце з 2-га, 3-га і 4-га абзацаў тэксту пяць пар слоў, што з'яўляюцца сродкамі, якія забяспечваюць тэматычную сувязь. Укажыце назвы гэтых сродкаў.

*Максімальны бал — 5.*

1. ____________________________________________ .
2. ____________________________________________ .
3. ____________________________________________

**Заданне 6.** Запішыце па два прыметнікі-сінонімы да фразеалагізмаў.

*Максімальны бал – 5.*

**Узор**. Біты воўк – чалавек … . — Біты воўк – чалавек *вопытны, бывалы*.

1. Блудны сын – чалавек ________________________________________.
2. Божая кароўка – чалавек ________________________________________.
3. Божы адуванчык – чалавек ________________________________________.
4. Дабёр бабёр – чалавек ________________________________________.
5. Залётная птушка – чалавек ________________________________________.

**Заданне 7.** Пра якую колькасць прадметаў ідзе гаворка ў прапанаваных фрагментах страражытных тэкстаў? Запішыце лічэбнікі словамі па-беларуску ў форме творнага склону адзіночнага ліку.

*Максімальны бал — 5.*

1)полъ третья десяте (гривьнъ)— ________________________________________;

2) полъ вторы тысящи (вои) — ________________________________________;

3) полъ четверта ста (душь)— ________________________________________;

4) двое (жеребят) — ________________________________________;

5) девятьдесят (сыров) — ________________________________________.

**Заданне 8.** Выпішыце са сказаў выказнікі і вызначце іх тыпы. Вызначце сінтаксічную функцыю інфінітыва.

*Максімальны бал — 5.*

1. Мне не трэба распавядаць доўга пра чароўны дом, убачаны ў сне.
2. Дазволь мне зараз, сябар верны, пачаць аповед пра сястру.
3. Яна яго не будзе бачыць, яна павінна ўсё прадбачыць.
4. Гаспадары выйшлі на ганак развітацца з гасцямі.
5. І я ўжо шукаць не маю ахвоты чаго лягчэйшага ў жыцці.

1. ________________________________________________
________________________________________________
2. ________________________________________________
________________________________________________
3. ________________________________________________
________________________________________________
4. ________________________________________________
________________________________________________
5. ________________________________________________
________________________________________________

**Заданне 9.** Вызначце жанр, назву твора і яго аўтара па ўказаных словах

*Максімальны бал — 5.*

1. Бітва крывавая, сын, зярняты, маці, дарога палявая, камень шчарбаты, чужынцы: ____________________________________________
2. Поле, хата, тканіны, думкі, збожжа, васількі, узор: ____________________ __________________________________________________
3. Крыніца, снег, жывучая вада, вольны свет, паэт: ______________________ __________________________________________________
4. Антоні, ягамосці, грыбы, Свержань, Міхалінка, сок, клёцкі: ______________ __________________________________________________
5. Жураўлі, Палессе, Беларусь, край, рай: _________________________________ __________________________________________________

**Заданне 10.** Указаны літаратуразнаўчыя тэрміны. Знайдзіце «трэцяга лішняга» ў кожнай групе. Выбар абгрунтуйце.

*Максімальны бал — 6 (1 бал за ўказанне "трэцяга лішняга" + 1 бал за абгрунтаванне)*

А) Амфібрахій, харэй, анапест.

Б) Раманс, раман, нарыс.

В) Метафара, эпітэт, песня.

А) ________________________________________________
__________________________________________________

Б) ________________________________________________
__________________________________________________

В) ________________________________________________
__________________________________________________

## Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

## XI клас

**(за кожную арфаграфічную і пунктуацыйную памылку здымаецца 0,1 бал)**

***Тэкст да заданняў 1 – 3.***

(1) Верш М. Багдановіча «Раманс» належыць да інцімнай лірыкі. (2) Гэта невялікі твор песеннага складу на тэму кахання. (3) У ім аўтар услаўляе маладосць лепшую пару жыцця пару светлага пачуцця, якое ўзвышае чалавека, робіць яго **духоўна** прыгожым.

(4) Да тэмы кахання звярталіся і звяртаюцца паэты ўсіх часоў і народаў. (5) Да «Раманса» ёсць эпіграф радкі з верша французскага паэта Сюлі-Прудома. (6) У перакладзе на беларускую мову яны гучаць так:

Калі заблішча гэта зорка,

Самая цудоўная, самая далёкая,

Скажыце ёй, што ёй належыць маё каханне,

О, апошнія з чалавечага роду.

(7) Эпіграф ключ да разумення асноўнай думкі твора. (8) Сюлі-Прудом раскрываў унутраны свет чалавека, яго інцімныя перажыванні. (10) Радкамі з верша Сюлі-Прудома, **дзе**, як і ў «Рамансе», выкарыстоўваецца вобраз зоркі, М. Багдановіч падкрэсліў, што тэма кахання вечная і агульначалавечая.

(11) У вершы паэт гаворыць ад уласнага імя, ад першай асобы. (12) Гэта — верш-маналог. (13) Думкі паэта такія блізкія і зразумелыя, што аўтарскае «я» зліваецца з асабістым, інцімным кожнага чалавека. (14) Таму так блізка і задушэўна ўспрымае чытач радкі верша.

(15) Аўтар звярнуўся да традыцыйных паэтычных вобразаў неба і зоркі. (16) Гэтыя словы ў паэтычнай мове верша апорныя. (17) Знаёмства з дзяўчынай, радасць першага спаткання, смутак развітання ўсё гэта напаўняе душу лірычнага героя і асацыіруецца з вобразам светлай і далёкай зоркі Венеры сімвала кахання, маладосці.

## Заданні

**Заданне 1.** Запішыце: 1) да якога стылю адносіцца тэкст; 2) якія сродкі сувязі выкарыстаны аўтарам тэксту ў першых двух абзацах; 3) якія словы складаюць аснову тэксту.

*Максімальны бал — 5.*

1. Стыль тэксту — ____________________________________________ .
2. Асноўныя сродкі сувязі двух абзацаў (з прыкладамі) — ______________
   ____________________________________________________________________
   ____________________________________________________________________
   ________________________________________________________
3. Аснову тэксту складаюць — _____________________________________
   ______________________________________________________________ .

**Заданне 2.** Запішыце патрэбныя словы, фразы.

*Максімальны бал — 5.*

1. З тэксту ў пачатковай форме сінонім-прыметнік да слоў: *глыбока асабісты, патаемны, запаветны* — _______________________________.
2. Антонім да прыслоўя, выдзеленага ў ***3-м*** сказе — _________________.
3. З тэксту словы са значэннямі: 1) ‘выслоўе, кароткая цытата, якая змяшчаецца ў пачатку твора ці асобнага раздзела і з'яўляецца своеасаблівым аўтарскім

тлумачэннем асноўнай ідэі твора’ — ________________________; 2) ‘пачуццё суму, маркоты, жалю’ — ___________________________ .

4. З ***13-га*** сказа словы, у якіх вымаўленне і напісанне не супадаюць — _____ ____________________________________________________________ .
5. Спалучэнне, якое з’яўляецца перыфразай, — _______________________ .

**Заданне 3.** Запішыце адказы на пытанні.

*Максімальны бал — 5.*

1. Да якой часціны мовы належыць выдзеленае ў ***10-м*** сказе слова? __________ ____________________________________________.
2. У тэксце выкарыстаны чатыры дзеясловы, якія заканчваюцца на ***-цца***. У якім дзеяслове, выдзяляецца постфікс***-ца***? — _____________________________ .
3. Устанавіце нумар сказа, у якім прапушчаны два працяжнікі. Як пішацца гэты лічэбнік у форме творнага склону адзіночнага ліку? — _____________. ____________________________________________________
4. Якія словы напісаны ў тэксце з арфаграфічнымі памылкамі? Як іх патрэбна пісаць ў адпаведнасці з нормамі? — __________________________________ ____________________________________________________________

**Заданне 4.** Суаднясіце часткі. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар.

*Максімальны бал — 5 (0,5 бала за кожную правільную пару)*

№1.А__Б__В__Г__Д__

| | |
|---|---|
| А) коврик под ноги; | 1) кажан; |
| Б) самодельный деревянный протез для ноги; | 2) кіях; |
| В) летучая мышь; | 3) каберац; |
| Г) сборник католических молитвенных песен; | 4) кантычка; |
| Д) кукурузный початок; | 5) кавяла. |

№2.А__Б__В__Г__Д__

| | |
|---|---|
| А) **Абсохлая** зямля пачала іскрыцца аксамітам кволай пахучай траўкі. | 1) дзейнік; |
| Б) **Паляваць** тут забаронена. | 2) выказнік; |
| В) Паэт умее прымусіць чытача паўней **адчуць** і глыбей **ацаніць** свабоду. | 3) дапаўненне; |
| Г) З сосен **цурком** бегла вада. | 4) азначэнне; |
| Д) **Спяваюць** птушкі з самай раніцы. | 5) акалічнасць. |

**Заданне 5.** Запішыце па-беларуску лічэбнікі XVI–XVII стст.

*Максімальны бал — 5.*

Купіў старац Мялецій на рынку для манастыра:

| Тое, што купіў | Старажытны лічэбнік | Сучасны запіс |
|---|---|---|
| судакоў і акунёў | полсемаста штук | |
| воск на свечкі | полпята фунта | |
| на коровей двор горшков | полшестадесять | |
| коней | двоенадцатеро | |
| сыроў | девятьдесят | |

**Заданне 6.** Адкажыце на пытанні: 1) Што аб’ядноўвае прыведзеныя выразы? 2) Чым яны адрозніваюцца? 3) Які выраз у прыведзеным радзе з’яўляецца лішнім? Патлумачце свой выбар.

*Максімальны бал — 5.*

Краіна ацтэкаў, краіна вікінгаў, краіна дзяцінства, краіна ўзыходзячага сонца, краіна гейзераў.

1. ____________________________________________________________
______________________________________________________________
____________________________________________________________

2. ____________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
____________________________________________________________

3. ____________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________

**Заданне 7.** Як адзначаў прафесар Павел Шуба, «спалучэнне з прыназоўнікам ***З*** выражае *прасторавыя*, *часавыя*, *прычынныя*, *акалічнасныя*, *мэт авыя*, *азначальныя*, *колькасныя*, *аб’ектныя*, *абмежавальныя* адносіны, а таксама *адносіны сумеснасці і ўласцівасці*». Запоўніце пустыя графы табліцы: пабудуйце словазлучэнні з прыназоўнікам ***З***, сфармулюйце сэнсавыя пытанні і вызначце сэнсавыя адносіны паміж кампанентамі словазлучэння.

*Максімальны бал — 5.*

| Галоўнае слова | Прына-зоўнік | Залежнае слова | Пытанне | Сэнсавыя адносіны |
|---|---|---|---|---|
| Заплакаць | з | гора | | |
| Чалавек | З | з | які? | |
| Арыя | з | оперы | | |
| Выйшаў | з | дзяўчынай | | |
| Прайсці | з | | | колькасныя |

**Заданне 8.** Перакладзіце сказы на беларускую мову і пастаўце знакі прыпынку. (2 балы) Устанавіце, у якім з іх магчыма розная пастаноўка знакаў прыпынку і патлумачце свой выбар. (2 балы) Якім тэрмінам называецца супадзенне лексічнага саставу сказа, што мае розныя сінтаксічныя сувязі? (1 бал)

*Максімальны бал — 5.*

1. 1. Горные вершины покрытые снегом пламенели в лучах восходящего солнца.
2. 2. Я взглянул в окно на небе начали зажигаться звёзды.
3. 3. Отец прочитал письмо молча отошёл к окну.
4. 4. Вверху над вершинами дубов собирались тёмные облака.

*Пераклад. (2 балы: 0,5 балы за правільна запісаны кожны сказ)*

1. ______________________________________________________________
______________________________________________________________.
2. ______________________________________________________________.
3. ______________________________________________________________.
4. ______________________________________________________________.

*Сказ, дзе магчыма розная пастаноўка знакаў прыпынку. Тлумачэнне. (2 балы)*

______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________

Тэрмін: ______________________________________________________.

**Заданне 9.** Прачытайце апісанне знешнасці Ганны з рамана І. Мележа “Людзі на балоце”. Выканайце заданні. 1. Выпішыце спачатку эпітэты (2 балы). 2. Затым словазлучэнні з метафарамі (2 бал). 3. Паразважайце (2–3 сказы), што́ падкрэсліваюць тут эпітэты і метафары? (6 балаў)

*Максімальны бал — 9.*

Як і раней, не было, здавалася, такой хвіліны, каб вочы яе, вільготна-цёмныя, падобныя на спелыя вішні, былі абыякавыя, нудлівыя. Увесь час блішчэла, ззяла ў іх няўціхнае хваляванне. Але сачылі яны з-пад шаўкавіста-чорных смелых броваў цяпер з падсцярожлівай, пільнай уважнасцю і, здавалася, толькі і чакалі выпадку кпліва падсмяяцца. Іншы раз маглі яны, як і раней, бліснуць весялосцю, але часта, вельмі часта гарэлі ў іх недавер’е і насмешка. У іх таксама ж нешта таілася, у цудоўных вішнёва-чорных вачах.

1. Эпітэты: ____________________

2. Метафары: ____________________

3. ____________________

**Заданне 10.** Указаны літаратуразнаўчыя тэрміны. Знайдзіце «трэцяга лішняга» ў кожнай групе. Выбар абгрунтуйце.

*Максімальны бал — 6 (1 бал за ўказанне “трэцяга лішняга” + 1 бал за абгрунтаванне)*

А) Амфібрахій, харэй, анапест.

Б) Раманс, раман, нарыс.

В) Метафара, эпітэт, песня.

А) ____________________

Б) ____________________

В) ____________________